# Заява беларускіх праваабарончых арганізацый

# "Скасаванне артыкула $193^1$ - недастатковы крок"

*Мінск, 18.05.2018 г.*

Саветам міністраў унесены ў парламент Праект закона Рэспублікі Беларусь “Аб змяненні некаторых кодэксаў Рэспублікі Беларусь”.

Сярод іншага, гэтым законапраектам прадугледжваецца выключэнне з Крымінальнага кодэкса артыкула $193^1$ "Незаконная арганізацыя дзейнасьці грамадзкага аб’яднаньня, рэлігійнай арганізацыі ці фонда альбо ўдзел у іх дзейнасьці" і ўвядзенне ў Кодэкс аб адміністратыўных правапарушэннях новага артыкула 23.88 з аналагічным зместам. Такім чынам адбываецца дэкрыміналізацыя дзейнасці ў складзе незарэгістраваных арганізацыяў і замена крымінальнай адказнасці на адміністратыўную ў выглядзе штрафа памерам да 50 базавых адзінак. Паўнамоцтвы разглядаць справы аб адміністратыўных правапарушэннях па артыкуле 23.88 прапануецца надаць органам юстыцыі і органам ўнутраных спраў, што азначае пазасудовы парадак накладання штрафаў.

Артыкул $193^1$ Крымінальнага кодэкса ад моманту з'яўлення быў прадметам крытыкі з боку беларускіх арганізацыяў грамадзянскай супольнасці, праваабаронцаў і міжнародных арганізацыяў як не адпавядаючы стандартам правоў чалавека і замацаванай у Канстытуцыі свабодзе аб'яднанняў. Рэкамендацыі пра скасаванне артыкула $193^1$ былі адрасаваныя Беларусі падчас першага (2010) і другога (2015) раўндаў Універсальнага перыядычнага агляду ў Савеце ААН па правах чалавека, неаднаразова даваліся ў межах дагаварных органаў ААН. Еўрапейская камісія за дэмакратыю праз права Савета Еўропы (Венецыянская камісія) ў 2011 годзе ў сваім адмысловым заключэнні канстатавала неадпаведнасць артыкула $193^1$ усеагульным стандартам правоў чалавека.

З улікам выкладзенага мы разглядаем захады па скасаванні артыкула $193^1$ Крымінальнага кодэкса як важны і неабходны крок у накірунку паляпшэння становішча са свабодай асацыяцыяў у Беларусі.

Разам з гэтым мы канстатуем, што намер замяніць крымінальную адказнасць за дзейнасць у складзе незарэгістраваных арганізацыяў на адміністратыўную сведчыць пра адсутнасць палітычнай волі да забеспячэння свабоды асацыяцыяў у нашай краіне.

Для сапраўднага вырашэння праблемы неабгрунтаванага абмежавання ўмоваў для стварэння арганізацый грамадзянскай супольнасці неабходнымі крокамі з'яўляюцца:

- Выключэнне з заканадаўства нормаў пра забарону дзейнасці незарэгістраваных арганізацыяў (частка 2 артыкула 7 закона "Аб палітычных партыях" і частка 2 артыкула 7 закона "Аб грамадскіх аб'яднаннях"), што дасць грамадзянам магчымасць для вольнай рэалізацыі свайго права на свабоду аб'яднанняў.

- Прывядзенне працэдуры рэгістрацыі грамадскіх аб'яднанняў, рэлігійных арганізацыяў і фондаў у адпаведнасць з міжнароднымі стандартамі, якая б забяспечвала ўсім жадаючым магчымасць зарэгістраваць некамерцыйную арганізацыю ва ўмовах адсутнасці дыскрымінацыі і неабгрунтаваных ці палітычна матываваных перашкодаў.

Мы заклікаем парламент пры разглядзе азначанага законапраекта:

- Выключыць з Крымінальнага кодэкса артыкул 193[1].
- Прагаласаваць супраць ўвядзення адміністратыўнай адказнасці ў выглядзе дапаўнення КаАП артыкулам 23.88.
- Распачаць публічнае абмеркаванне з усімі зацікаўленымі суб'ектамі далейшых зменаў заканадаўства, якое рэгулюе стварэнне і дзейнасць арганізацый грамадзянскай супольнасці.

*Асветніцкая ўстанова «Центр прававой трансфармацыі”*

*Асамблея няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларуси*

*Публічная ўстанова "Беларускі дакументацыйны цэнтр"*

*Праваабарончы цэнтр "Вясна"*

*Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Прававая ініцыятыва"*

*Рэспубліканскае праваабарончае грамадскае аб'яднанне "Беларускі Хельсінкскі Камітэт»*

*Беларускі дом правоў чалавека імя Б.Звозкава*

*Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя журналістаў»*

*Камітэт «Салідарнасць»*

*Экспертна-прававое таварыства «Ініцыятыва FORB»*